View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



# ИСТОРИКО–КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ТУРИЗМА И ГОСТЕПРИИМСТВА

УДК 908 (476.7)



**М.В. ЦУБА**, канд. гіст. навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гісторыка–культурнай спадчыны
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Пінск, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 2 апреля 2018г.*

## ГРАМАДСКА–РЭЛІГІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ІААНА ЛОЙКІ Ў ХОРАСТАЎСКІМ КРАІ

*У дадзеным артыкуле падрабязна даследуецца рэлігійная дзейнасць і трагічны лёс праваслаўнага святара Іаана Сямёнавіча Лойкі, які ў гады ваеннага ліхалецця быў зажыва спалены разам з вернікамі свайго прыходу фашысцкімі акупантамі ў вёсцы Хорастава за тое, што аказваў дапамогу партызанам.*
*Асаблівая ўвага надаецца непасрэдна рэлігійнай працы і выкананню царкоўных абавязкаў І.С. Лойкі ў час Вялікай Айчыннай вайны.*

***Ключавыя словы:*** *святар, праваслаўная канфесія, прыход, карная аперацыя, набажэнства, ахвяры.*

**Прадмова.** На тэрыторыі Хорастаўскага сельсавета (уваходіў у былую Пінскую вобласць, зараз Салігорскі раён, Мінская вобласць) ў гады Вялікай Айчыннай вайны адбыліся падзеі, якія адыгралі вялікую ролю ў гісторыі партызанскага руху Беларусі. Ураджэнцам вёскі Хорастава В.З. Каржом быў створаны першы ў Вялікай Айчыннай вайне партызанскі атрад. У гэтым атрадзе мужна змагаліся будучыя героі В.З.Харужая, А.Я.Кляшчоў, а таксама яшчэ адзін вядомы прадстаўнік вёскі Хорастава Р.С.Карасёў – адзін з арганізатараў партызанскага руху на Піншчыне, імя якога носяць вуліцы ў Пінску і Лунінцы. Жыхарамі Хорастаўскага сельсавета і адначасова прыхаджанамі хорастаўскай царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы з’яўляліся браты–патрыёты Міхаіл і Іван Цубы з вёскі Навіна.

На тэрыторыі сельсавета размяшчаліся штаб Пінскага партызанскага злучэння, аэрадром, шпіталь, друкарня газеты ”Палеская праўда“. На часовай дыслакацыі ў 1942 і 1943 гадах тут знаходзілася злучэнне партызан Украіны на чале са знакамітым С.А.Каўпаком.

Памятае хорастаўская зямля і асобу вядомага святара ў нашым краі Івана Сямёнавіча Лойку. Падчас ваеннага ліхалецця, маючы вялікі аўтарытэт сярод вернікаў, бацюшка ні аднаго з мясцовых жыхароў змог пересцерагчы ад супрацоўніцтва з акупантамі. У выніку фашысты так і не змаглі стварыць ні адзінага паліцэйскага участка на Хорастаўшчыне. Не раз І.С. Лойка выказваўся супраць кампаніі акупацыйных улад па вывазу моладзі на прымусовыя работы ў Германію і прылюдна благаслявіў сваіх сыноў ісці ў партызаны. Бясспрэчна, гэта паспрыяла масаваму збегу моладзі ў партызанскі атрад “Камарова” (В.З. Каржа), які прыбыў з Пінска і дзейнічаў паблізу Хорастава. Дарэчы сам Васіль Захаравіч Корж увесь час падтрымліваў самыя добрыя ўзаемаадносіны з І.С. Лойкам і яго сям’ёй.

У гады вайны І.С. Лойка заўсёды імкнуўся маральна падтрымаць праваслаўны люд. Гэтая падтрымка ажыццяўлялася праз служэнне Богу і дапамозе вернікам малітвамі і суцяшэннем, прычым бацюшка ніколі не забываў прывіваць сваім прыхаджанам веру ў перамогу над ворагам.



Полесгу

Аб патрыятычнай барацьбе і трагічных наступствах ваеннага ліхалецця ў Хорастаўскім краі напісанна нямала. І амаль усюды ў больш–менш грунтоўных работах па–крысе, па дробязях усплывае неардынарная фігура свяшчэнніка І.С. Лойкі. Наша задача сабраць усе гэтыя разрозненыя ў разнастайнай літаратуры і архівах матэрыялы, дакументы, звесткі, а таксама ўспаміны людзей у адзінае цэлае. Для таго каб праўдзіва і аб'ектыўна паказаць гераічны і адначасова трагічны жыцёвы лёс настаяцеля хорастаўскай царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы бацюшкі Іаана Лойкі, які прыняў пакутніцкую смерць разам з сваімі прыхаджанамі не скарыўшыся перад ворагам.

Няма сумнення, што І.С.Лойка з'яўляецца сапраўдным народным, праваслаўным героем–святаром, дастойным таго, каб пра яго жыццё, служэнне Богу, Радзіме і людзям ведалі нашчадкі.

Асноўная частка.

Іван Сямёнавіч Лойка нарадзіўся 1 студзеня 1885 года непадалёку ад Мінска, у невялікім старажытным гарадку Заслаўль. Яго бацька Сямён Іванавіч Лойка быў вядомым героем руска–японскай вайны 1904–1905 гг. У ходзе якой за адвагу і гераізм быў узнагароджаны трыма Георгіеўскімі крыжамі. Гэта дае падставы лічыць, што любоў да Радзімы і патрыятызм у будучага святара Іаана былі запраграміраваны ў бацькоўскіх генах.

У 1897 годзе Іван Лойка скончыў Заслаўскую народную школу. Гісторыя самога Заслаўля, з якога пачалося распаўсюджванне праваслаўнай веры на беларускіх землях князёўнай Рагнедай і яе сынам Ізяславам, а таксама багатыя духоўныя традыцыі гэтага гарадка,шматлікія божыя храмы, у рэшце рэшт, зрабілі сваю справу ў далейшым жыццёвым выбары кемлівага і дапытлівага маладога чалавека. У 1905 годзе ён паспяхова здае экзамен пры Мінскай кансісторыі і атрымлівае званне псаломшчыка. Пасля гэтага яго накіроўваюць на службу ў Вілейскую царкву, што знаходзілася ў Барысаўскім павеце. Па доўгу службы І.С. Лойка часта наведваў Мінск. Падчас адной з такіх паездак ён пазнаёміўся з Вольгай Міхайлаўнай Сакалоўскай. У Мінску ў 1906 годзе маладыя людзі абвянчаліся. Адразу, у гэтым жа годзе прыйшлося змяніць месца працы. Іван Сямёнавіч Лойка атрымоўвае новае назначэнне псаломшчыкам у храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёску Хорастава. Тут у агульнай колькасці святар Іаан праслужыў болей 28–мі гадоў. Менавіта ў Хораставе ў сям'і Лойкаў нарадзілася чацвёра дзяцей, тры сыны і дачка: Уладзімір – 1906 года нараджэння, Леанід – 1908 г.н., Юрый – 1910г.н., і Вера – 1925 г.н.

Бясспрэчна, што драўляную хорастаўскую царкву ў імя Пакрова Божай Маці нельга было назваць прэстыжным прыходам. Вёска Хорастава непрыкметна схавалася ў далечыні ад якіх–небудзь больш–менш значных шляхоў, якіх звязвалі б яе з гарадамі ці нават мястэчкамі, размясціўшыся паміж багнаў знакамітага балота Грычын. На пачатку ХХ стагоддзя сем'ямі прыхаджан тут з'яўляліся пераважна малазямельныя сяляне, якія ў сваёй большасці вялі жабрацкае існаванне. З гэтага вынікае, што беднымі былі дары духоўным пастырам за правядзенне розных царкоўных абрадаў.

Трывожныя падзеі на Палессе прынёс жнівень 1914 года – пачалася Першая сусветная вайна. Шмат мужчын прыхаджан прызыўнога ўзросту благаслаўлёныя на ратныя подзвігі святарамі царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы былі закліканы на фронт. Акрамя таго ва ўсіх цэрквах мазырскага павета, у які ўваходзіла тады хорастаўская Пакроўская царква, быў прачытаны малебен у якім прапаведавалася аб'яднанне ўсіх слаёў грамадства вакол самадзяржаўя, прапагандаваліся ідэі грамадзянскай згоды ў імя абароны Айчыны. У дадзеным малебне зазначалася, што "…яшчэ ніколі так не аб'ядноўваліся ў нас цар, правадыры і народ,як у сёняшні час. Цяпер ва ўсіх ад цара да прасталюдзіна толькі адна думка і адзінае жаданне: давесці вайну да пераможнага канца, канчаткова зламаць нахабнага ворага і гэтым надоўга забяспечыць мір і сабе, і ўсяму свету" [1]. Таксама, вядома, што Пакроўская царква прымала ўдзел у зборы ахвяраванняў на карысць расійскай арміі. У сувязі з чым яна далучылася да заклікання епіскапа Мінска–Тураўскага Мітрафана (Краснапольскага), які напачатку 1915 года заклікаў праваслаўнае духавенства і паству "…з ахвотай і радасцю несці свае ахвяраванні на справу добрапрыстойную і святую" [2]. Няма сумненняў, што ва ўсіх вышэй пералічаных мерапрыемствах самы актыўны ўдзел прымаў псаломшчык Хорастаўскай царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы Іван Сямёнавіч Лойка.

З прыходам да ўлады бальшавікоў у 1917 годзе рэзка змяніліся дзяржаўныя аднсіны да царквы. З самага пачатку свайго існавання савецкія ўлады распачалі жорсткую барацьбу з рэлігіяй, якая абвешчалася "опіюмам народа" і правазглашалася шкоднай, небяспечнай для савецкай дзяржаўнай сістэмы. У выніку зачыняліся касцёлы, манастыры і цэрквы, шырока распаўсюджвалася атэістычная літаратура, дзе абражаліся пачуцці святароў і вернікаў. Аднак няма ліха без дабра. Размешчанную паводдаль і забытую ўсімі хорастаўчшыну дадзеныя адмоўныя перамены закранулі менш

ПолесГУ

ўсяго. І ўсё ж ва ўмовах прапаганды атэізму і тут не проста было з'яднаць вакол сябе паству. Тым не менш э гэтай задачай святары хорастаўскай царквы выдатна спраўляліся, іх прыход колькасна павялічваўся.

18 лютага 1918 года Германія аднавіла сваё наступленне на ўсім усходнем напрамку, і ўжо праз тыдзень Мазырскі павет быў поўнасцю акупіраваны. У хуткім часе настаў перыяд, калі адны ўлады зменьваліся іншымі на працягу некалькіх месяцаў. Восенню 1918 г., пасля таго як нямецкія войны былі адкліканы з Усходняга фронту, хорастаўскую мясцоваць занялі войскі Савецкай Расіі, потым польскія легіянеры, а затым зноў прыйшлі бальшавікі. Менавіта ў гэты перыяд, калі ўлады хутка мяняліся, не паспеваючы за кароткі тэрмін як след наладзіць сістэму джяржаўнага кіравання (не збіраліся падаткі, не выконваліся павіннасці, лес быў нічыйным),прыхаджанне і царква змаглі вырашыць свае шматлікія бытавыя праблемы. Згодна з успамінамі людзей многа народу за гэты час пабудавала новыя хаты. Не засталася па за ўвагай прыхаджан і царква. Дзякаючы намаганням і клопату І.С. Лойка, а таксама іншых тутэйшых святароў быў праведзены капітальны рамонт хорастаўскага божага храма, ды яшчэ зроблены дзве невялікія прыбудовы да яго.

Аднак фактычнае безуладдзе, якое так падабалася мясцоваму люду, скончылася ў красавіку 1921 года, калі Хорастава і навакольныя вёскі апынуліся ў складзе Польшчы. Зразумела, што з усталяваннем польскай улады на Хорастаўшчыне на працягу 1921–1939 гг. дзяржаўная падтрымка аказвалася толькі каталіцкай канфесіі, а гэта значыць касцёлу Святой Ганны, што знаходзіўся ў пяці км ад Хорастава ў вёсцы Пузічы. Неабходна заўважыць, што ў дадзенай сітуацыі як святары хорастаўскай царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы, так і святары пузічскага касцёла Святой Гнны занялі вельмі разумную і канструктыўную пазіцыю. Яны заўсёды падтрымлівалі добрыя ўзаемаадносіны паміж сабой і ніколі не схілялі мясцовае насельніцва да пераходу з адной канфесіі ў іншую.

Такім чынам, паству ў хорастаўскай царкве ажыццяўлялі вельмі руплівыя служыцелі праваслаўнай веры і адданыя духоўныя настаўнікі сваіх вернікаў. А сярод іх вызначаўся псаломшчык Іаан Лойка. Патрыятызм святара І. С. Лойкі быў прывіты яму з маленства родным бацькам С. І. Лойкам і засноўваўся не толькі на глыбокай праваслаўнай веры, але і на любові да роднай Бацькаўшчыны, любові да саёй паствы. Гэта высакароднае пачуццё бацюшка Іаан пранёс праз усё сваё жыццё. У 1924 годзе руплівая, царкоўная праца Івана Сямёнавіча Лойкі была заўважана і адзначана правячым Палескім і Пінскім епіскапам Аляксандрам (Іназемцавым). Згодна з загадам "…за асаблівую стараннасць у службе, псаломшчык Лойка І. С. удастояны права насіць стыхара [3, с. 190 – 191]. Гэта значыць спецыяльнага богаслужбовага адзення святарскіх і царкоўных служачых, аблачэнне ў якое азначае высокае служэнне і выказвае духоўную радасць аб Госпадзе, а таксама ўнушае чысціню жыцця.

Не раз вернікі хорастаўскага прыходу звярталіся да І. С. Лойкі і К. П. Раіны з рознымі пытаннямі не толькі духоўнага, але і грамадска–палітычнага характару. Так як адбывалася ў гэты час столькі змен і падзей у якіх простаму абывацелю разабрацца было вельмі цяжка. І ў такіх выпадках святары праводзілі вялікую выхаваўчую работу з мясцовым насельніцтвам. Адным словам, ні ў чым стараліся не адказваць сваёй пастве, дзялілі з ёй ўсе цяжкасці і радасці жыцця. Адпаведна, за гэта былі паважанымі і любімымі сярод сваіх прыхаджан.

Аднак усё ж шляхі–дарогі хорастаўскіх святароў разышліся. Спачатку ў 1934 годдзе вопытнага, ведаючага ўсе дробязі царкоўнай службы псаломшчыка І. С. Лойку з мэтай далейшага кар'ернага росту перавялі ў царкву Свята–Пакрова ў вёску Мокрава што на Лунінеччыне. А затым у 1935 годдзе К. П. Раіна быў узведзены ў сан протаіерэя і прызначаны благачынным Пінскай Заходняй царкоўнай акругі і адначасова настаяцелем царквы ў вёсцы Хойна, што паблізу Пінска.

З лета 1935 г. да пачатку 1942 г. прыход хорастаўскай царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы ўзначальваў Буката Адам Захар'евіч. Яго пастырскае служэнне была неразлучна звязана з нашым краем. З 1909 года А.З. Буката служыў псаломшчыкам, а затым дыяканам у царкве, што знаходзілася ў бліжайшым да Хорастава мястэчку Ленін. А атрымаўшы сан протаіерэя быў накіраваны ў хорастаўскую царкву. Апасля, падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенныя гады А.З. Буката служыў другім свяшчэннікам у Нясвіжскай царкве Святога Георгія. Тагачасны Нясвіжскі благачынны Дзмітрый Хмель вельмі станоўча ацэньваў яго працу: "Протаіерэй бацюшка Адам Буката пастыр на вышыні свайго служэння. Руплівы малітоўнік, добры знаўца царкоўнага хараво-га спеву. У прыватным жыцці паводзіць сабе прыкладна" [3, с. 190].

Але не ўсё так як хацелася атрымлівалася, не ўсё добра ладзілася ў бацюшкі Адама ў хорастаўскай Пакроўскай царкве. На Хорастаўшчыне ў гэты перыяд польскімі уладамі працягвала

праводзіцца палітыка асадніцтва. Гэта азначае, што былыя афіцэры і салдаты польскай арміі – удзельнікі савецка– польскай вайны 1919 – 1920 гг. надзяляліся землямі (павінны былі асядаць на гэтых землях) на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Больш паловы ад агульнай колькасці (каля 5тыс. асаднікаў) былі паселяны ўздоўж савецка–польскай мяжы, якая праходзіла ўсяго за 10 км. ад Хорастава. Будучы праваднікамі польскай палітыкі на беларускіх землях асаднікі рабілі сваю справу. У выніку ў Хораставе была зліквідавана праваслаўная царкоўна– прыхадская школа. Замест яе з'явілася некалькі школак з польскай мовай навучання, адбывалася паступовая паланізацыя мясцовага насельніцтва, пашыраліся ўплывы каталіцкай канфесіі. Шмат хто з прыхаджан хорастаўскай Пакроўскай царквы ў гэты час успаміналі аб І. С. Лойку і К. П. Раіне, якія не ў простых умовах і абставінах умелі і маглі на высокім узроўні падтрымліваць прэстыж і аўтарытэт праваслаўнай веры ў нашым краі.

Нічога не змянілася ў лепшы бок для хорастаўскага царкоўнага прыходу і пасля 17 верасня 1939 года, калі фарміраванні Чырвонай Арміі перайшлі савецка–польскую граніцу і ўжо ў першы дзень дадзенага паходу Хорастаўшчына аказалася пад савецкай уладай. Адразу было забаронена рэлігійнае выхаванне моладзі. Прадстаўнікамі савецкай улады падчас розных сабранняў і мітынгаў прапагандаваліся атэізм і вера ў матэрыялізм, а таксама сярод насельніцтва распаўсюджвалася антырэлігійная літаратура. Дайшло і да канкрэтных спраў. На некаторых скрыжаваннях дарог, што вялі ў Хорастава невядомымі былі зрэзаны крыжы. Многія разумелі, як не хапала ў гэты час ранейшых хорастаўскіх святароў, якія нават у прыватнай размове знаходзілі словы і дакладныя, пераканаўчыя прыклады, перасцярагаючыя людзей ад падобных учынкаў.

Вялікая Айчынная вайна застала царкоўнае жыццё ў істотным заняпадзе. Многія божыя храмы былі зачыненыя, некаторыя спаленыя, разбураныя, альбо перароблены і прыстасаваныя пад склады, канюшні, архівы, а таксама пад розныя забаўляльна–гульнявыя ўстановы. Значная частка святароў у тым ліку і праваслаўнай канфесіі была рэпрэсіраваная. Аднак горыч аб перанесеных рэпрэсіях у адносінах да духавенства з боку савецкай улады не засланіла свядомасць агульнай бяды, якая прыйшла на беларускую зямлю з пачаткам нацысцкай акупацыі. Народ не прыняў "новага фашысцкага парадку" і падняўся на барацьбу. Разам з народам зрабілі крок у гэтым накірунку і шматлікія прадстаўнікі ў першую чаргу праваслаўнага духавенства.

Вялікую патрыятычную работу падчас першага года вайны праводзіў у мокраўскай Пакроўскай царкве Іван Сямёнавіч Лойка. Тут ён атрымаў сан дыякана, а за тым святара, узначаліўшы мясцовы прыход. Бацюшка Іаан заўсёды падтрымліваў самую цесную сувязь са сваім кумам благачынным ўсёй Пінскай царкоўнай акругі протаіерэем Кузьмой Пятровічам Раінай прычым ні ў аднаго, ні ў другога не было ніякіх ваганняў, чый бок заняць у смяртэльнай бітве з гітлераўскімі прыгнятальнікамі. Абодва падтрымлівалі кананічную сувязь са сваёй Патрыярхіяй, а нямецкую акупацыю лічылі часовай з'явай. Вядома, што на неаднаразовыя патрабаванні каменданта Пінска да святароў Пінскай царкоўнай акругі ўвесці ў набажэнства словы: "Аб вызваленай краіне Расійскай і пераможным германскім воінстве Госпаду памолімся" у большасці божых храмаў, у тым ліку ў Свята– Пакроўскай царкве, бацюшкам Іаанам чыталася малітва "Аб краіне нашай, уладзе і войску яе Госпаду памолімся" [4]. Такім чынам Іван Сямёнавіч Лойка падтрымліваў у сваіх прыхаджан веру ў будучую перамогу над фашысцкай Германіяй.

Па ўспамінах мясцовых жыхароў з вёсак Мокрава і Сінкевічы Свята–Пакроўская царква падчас акупацыі з'яўлялася тым месцам, куды прыходзілі ўсе – прыхаджан стала болей, так як у царкву ішлі нават тыя, хто страціў усялякую надзею, што–нібудзь даведацца аб сваіх блізкіх, прыходзілі вянчацца і хрысціць дзяцей нават далёкія ад рэлігіі людзі – тыя, хто не жадаў мець ніякіх спраў з нямецка–акупацыйнымі ўстановамі. У цяжкі час іспытаў людзі заўсёды ішлі за Божай дапамогай. Яны ішлі ў царкву ў першую чаргу за маральнай падтрымкай, якая ажыццяўлялася бацюшкам Іаанам праз служэнне Богу і проста суцяшэннем. Зразумела, што бацюшку Іаану і яго блізкім і таксама тым святарам, якія займалі падобную пазіцыю рана ці позна пагражала расправа з боку нямецкіх акупацыйных улад. Гэта было відавочна для ўсіх.

Вядома, што на самым пачатку вайны ў Пінску ўраджэнцам вёскі Хорастава В. З. Каржом быў створаны першы партызанскі атрад у Вялікай Айчыннай вайне, які налічваў 60 чалавек [4, с. 25]. Гэты атрад пасля 2–х баёў пад Пінскам, вымушаны быў адступіць і базіраваўся на тэрыторыі Столінскага раёна [5, с. 58]. Дадзены атрад быў амаль адзіным атрадам, які не распаўся ў першую ваенную зіму і праіснаваў да самага вызвалення Беларусі. А здарылася гэта ў значнай ступені таму, што свой атрад В.З. Корж прывёў у родныя мясціны паблізу Хорастава, дзе яго добра ведалі людзі і падтрымлівалі ў цяжкую хвіліну. Рух са Століншчыны ў родную для камандзіра атрада Хорастаўшчыну ляжаў менавіта, праз Сінкевічы і Мокрава, дзе па ўспамінах партызан адбыўся

начлег. Няма сумненняў, што тут Корж і бацюшка Іаан сустрэліся як добрыя знаёмыя. Так як бацькі Каржа – Захар Рыгоравіч і Аляксандра Фёдараўна з'яўляліся прыхаджанамі хорастаўскай Пакроўскай царквы, а іх сын Васіль Корж у маленстве (1900г.) быў у ёй ахрышчаны, а затым хадзіў у царкоўна–прыхадскую школу. Аб чым ішла размова сказаць цяжка, але хутчэй усяго Васіль Корж прапанаваў бацюшку Іаану са сваімі блізкімі вяртацца назад ў Хорастава, абяцаючы ім абарону ад фашысцкай нечысці. Сагласаваць далейшыя пытанні аб вяртанні ў Хорастаўскую царкву Пакрова Прасвятой Багародзіцы з благачынным Пінскай царкоўнай акругі К.П. Раінай было не складана.

Нягоды вайны і перыяду акупацыі моцным цяжарам леглі на плечы ўсяго насельніцтва. Не адрозніваліся ў матэрыяльным становішчы ад сваіх вернікаў і святары. Па–гэтаму, як толькі вясной 1942 года бацюшку Іаану прыйшло паведамленне аб пераводзе Адама Захар'евіча Буката свяшчэннікам у Нясвіжскі храм Святога Георгія, ён тут жа сабраў свой небагаты пажытак і разам з сваімі ўжо дарослымі дзецьмі і матушкай Вольгай накіраваўся ў так дарагое яго сэрцу Хорастава, дзе прайшлі лепшыя гады жыцця. Па сведчанню відавочцаў, уся вялікая сям'я Івана Сямёнавіча Лойкі крочыла пяшком за возам, на якім знаходзіліся трое малых дзетак старэйшага сына бацюшкі Уладзіміра, ды яшчэ самыя неабходныя рэчы. Вестка аб вяртанні бацюшкі Іаана вельмі хутка абляцела ўсю вёску і ў хуткім часе каля царквы сабраўся амаль увесь прыход. Тут жа бацюшку Іаану было расказана аб расстрэлах і зверствах фашыстаў у дачыненні да мірнага насельніцтва, аб масавых забойствах еўрэяў на Хорастаўшчыне. "Разам жылі ў непросты даваенны час, разам і вайну перажывём, а там пасля вызвалення ад германскіх супастатаў жыць стане лепш" – супакойваў ён прыхаджан. А яны яго слухалі са слязамі на вачах і верылі, што так яно і будзе. Бо, што гаварыў раней Іван Сямёнавіч Лойка заўсёды збывалася. Тут бацюшка Іаан не меў патрэбы ў прадстаўленні, так як усе яго добра ведалі. А яму самаму таксама ўсё было знаёма і блізка. Больш за 28 гадоў ён праслужыў псаломшчыкам у царкве Пакрова Прасвятой Багародзіцы і ўсіх сваіх прыхаджан, не толькі з Хорастава, але і з Пузіч, Чаланца, Навіны, Рахавіч, Груздава, Вейна і іншых вёсак і хутароў помніў і ведаў у твар. Тут многа было сяброў, прыяцеляў, добрых знаёмых.

Шкада, што не захавалася фотаздымкаў І. С. Лойкі, але па апісанню прыхаджан і А. Ф. Ясько ў кніжцы "Больно даже мёртвым" ён паўстае перад намі чалавекам сярэдняга целаскладу з русымі валасамі і светлашэрымі вачыма, быў невысокага росту, валодаў харошым музыкальным слухам і прыемным голасам. Амаль пагодкі, з нязначнай розніцай ва ўзросце, усе яго тры сыны – Уладзімір, Леанід і Юрый, таксама валодалі выдатным пеўчым талентам. Яшчэ са школьнай пары яны ахвотна і паспяхова спявалі ў царкоўным хоры. Не пакінулі яны свайго захаплення спяваць і стаўшы дарослымі. У старэйшага Уладзіміра да моманту пасвячэння яго бацькі ў сан свяшчэнніка і назначэння настаяцелем прыхода Хорастаўскай Пакроўскай царквы, як была вышэй адзначана мелася ўжо трое дзетак. А але ён працягваў спяваць у царкоўным хоры. У адным шэрагу з ім, у хоры, заўсёды стаялі і яго малодшыя браты Леанід і Юрый, а затым да іх далучылася зусім яшчэ юная сястра Вера. Вялікі аматар царкоўных харавых спеваў, прыхаджанін з вёскі Пузічы Пракаповіч Андрэй Рыгоравіч увесь час успамінаў, як ён заслухваўся прыгожымі, меладычнымі і добра пастаўленнымі галасамі сямейства бацюшкі Іаана [3,с. 191, 192].

Парафіяльныя свяшчэннікі, у адрозненне ад гарадскіх, былі вельмі цесна звязаны са сваімі прыхаджанамі праз споведзь. Споведзь збліжала, моцна ўплывала на думку людзей, на іх погляды, настроі. Падчас службы ўсё гэта дапамагала бацюшку Іаану ўсяляць упэўненасць сваім прыхаджанам у будучую перамогу над ворагам. А з амвона хорастаўскай царквы Прасвятой Багародзіцы працягвалі гучаць малебны "Аб краіне нашай, уладзе і войску яе Госпаду памолімся".

Аб станоўчых якасцях характара бацюшкі Іаана, яго глыбокай веры і адданасці Богу і царкоўнай службе ёсць успаміны занатаваныя яго хрэснікам, кандыдатам багаслоўя Паўлам Кузьмічом Раінай: "Саслужнік і сябар майго бацькі, мой хросны, чалавек глыбока рэлігійны, строгі да сябе і спагадлівы да блізкіх. У жыццёвых справах нетараплівы, разважлівы, заўсёды спакойны. Яго набажэнствы як у перапоўненым храме падчас службы, так і з адным псаломшчыкам альбо матушкай Вольгай на кліросе заўсёды былі поўныя веры і руплівасці"[6, с.35].

Даволі блізкія адносіны звязвалі бацюшку Іаана з легендарным партызанскім камандзірам В.З. Каржом. Васіль Захаравіч Корж, які з лістапада 1942 года стаў камандзірам Пінскага партызанскага злучэння быў чалавекам веруючым, что пацвярджаецца шматлікімі фактамі, а так сама добрымі ўзаемаадносінамі як з бацюшкам Іаанам, так і з настаяцелем пузічскага касцёла Святой Ганны ксяндзом Францішкам Кубшам. Аднак не трэба забываць, што В.З. Корж з'яўляўся членам партыі – гэта значыць чалавекам савецкай дзяржаўнай сістэмы, якая на працягу ўсяго свайго існавання

Полесгу

вяла безперапынную барацьбу з рэлігіяй. І ўсе ж патрэбна адзначыць, што гэтае змаганне мела свае пад'ёмы і спады. Менавіта падчас Вялікай Айчыннай вайны, калі кіраўніцтву СССР было не да разборак з святарамі і веруючымі, наглядалася пэўная лаяльнасць да рэлігіі.

Вядомы факт, калі на В.З. Каржа адным з камандзіраў атрада, што ўваходзіў у Пінскае партызанскае злучэнне В.А. Васільевым быў зроблены данос, які дайшоў да кіраўніка Цэнтральнага Штаба Партызанскага Руху (ЦШПР) П.К. Панамарэнка, дык той разабраўшыся ў сітуацыі проста праігнараваў яго. А ў даносе наракалася на тое, што Корж вакол сябе сабраў сваіх сваякоў з вёскі Хорастава, ды завёў моцнае сяброўства з мясцовым бацюшкам Іаанам, да якога часцяком заезжае на чарку [3,с.194]. Пра сяброўства з мясцовым бацюшкам узгадвае ў сваім дзённіку і сам Корж. Ён зазначае, што патрэбна было перавыхоўваць уведзенных ворагам у зман людзей, няцвёрдых і няўпэўненых змагацца літаральна за кожнага чалавека. Таму што "фашысты стараюцца пагрозамі абяцаннямі і ліслівасццю завербаваць да сябе сляпых выканаўцаў злачынстваў. Наша задача адкрыць ім вочы, змагацца за душы абманутых" [7, с.196].

І на гэтым участку работы В.З. Корж вялікую ролю адводзіў бацюшку Іаану, з якім перыядычна сагласоўваў тыя ці іншыя пытанні.

Набліжаўся 1943 год, які войдзе ў гісторыю як пераломны ў ходзе Вялікай Айчыннай і Другой Сусветнай войн. У гэты час атрымала шырокае распаўсюджанне сярод беларускага насельніцтва і партызан дастаўленае ў лістоўках з "Вялікай Зямлі" перадкаляднае пасланне ад 13 снежня 1942 года Патрыяршага Сергія, які звяртаючыся да насельніцтва на захопленых ворагам землях, пісаў: "Удзельнік партызанскай вайны – не толькі той, хто са зброяй у руках нападае на варожыя атрады, але і той, хто пастаўляе партызанам хлеб; хто хавае іх ад здраднікаў і шпіёнаў, хто ўхажвае за параненымі. Не давайце ворагу адчуваць сябе гаспадаром на вашай зямлі. Хай тыл для яго будзе не лепш фронту. Такім чынам, будзьце адважнымі, стойце мужна і непахісна, абараняючы веру і годнасць, і верце ў выратаванне Госпада" [8].

На сваім чарговым богаслужэнні напрыканцы 1942 года бацюшка Іаан не толькі зачытаў перад усімі прыхаджанамі вышэйадзначанае пасланне, але і прылюдна благаславіў сваіх сыноў Уладзіміра, Леаніда і Юрыя перад адыходам іх у партызанскі атрад: " Мая зброя на ворагаў Крыж Святы, а вы будзьце Богам захоўваемыя і сумленна служыце Бацькаўшчыне" [3, с.192].

У выніку бяручы прыклад з сыноў свяшчэнніка, і улічваючы яго заклік, уся мясцовая моладзь, апасаючыся вывазу акупацыйнымі ўладамі на прымусовыя работы ў Германію, масава пайшла ў партызаны.

Напярэдадні зімы 1942–1943 гг. партызанская зона, якая была пад кантролем Пінскага партызанскага злучэння, пашырылася на ўсю тэрыторыю Ленінскага, Ганцавіцкага, значную частку Лунінецкага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага і Іванаўскага раёнаў. У самым канцы 1942 года ў раён сканцэнтравання пінскіх партызан прыбыло і злучэнне ўкраінскіх партызан на чале з С.А.Каўпаком. Безумоўна, канцэнтрацыя такіх значных партызанскіх сіл, як злучэнні Каржа і Каўпака ў адным рэгіёне, не засталіся незаўважанымі для германскіх войск. Немцы вырашылі выкарыстаць гэтыя абставіны не толькі для барацьбы з партызанскім рухам, але і для расправы над мірным насельніцтвам. У выніку колькасць войск вермахта, задзейнічаных у аперацыі пад кодавай назвай "Горнунг" (Люты) склала каля дваццаці тысяч чалавек [4, с.31]. У загадзе на гэтую карную аперацыю адзначалася, што раён аперацыі – "сапраўдная Савецкая рэспубліка", дзе адноўлены мясцовыя органы Савецкай улады, камендатуры, праводзіцца агульная мабілізацыя. У сувязі з чым усім сілам карнікаў загадваецца ў гэтым раёне знішчыць усё, "што можа служыць абаронай і жыллём", ператварыць раён у "нікім не занятую прастору, мясцовае насельніцтва расстраляць жывёлу, збожжа і прадукты забраць" [8, с.334]. 10 лютага адбылася першая атака карнікаў супраць партызан атрада імя Кірава. Каб захаваць злучэнне і пазбегнуць вялікіх страт, было вырашана адыходзіць у іншыя месцы, манеўраваць, рабіць на праціўніка нечаканыя напады і вылазкі. І ўсё ж пад націскам лепш узброенага і значна пераўзыходзячага ў жывой сіле праціўніка, атрады Пінскага злучэння вымушаны былі адыходзіць назад на Хорастаўшчыну, дзе замкнулася кальцо акружэння [8, с. 334]. Ёсць звесткі, што пры адыходзе партызан з Хорастава бацюшку Іаана наведаў ардынарэц Каржа, прапанаваўшы яму з'язжаць разам з атрадам. Але абставіны складваліся так, што з партызанамі змагла з'ехаць прыкладна толькі палова насельніцтва з Хорастава і навакольных вёсак. Гэта ў першую чаргу тыя, хто меў дарослых дзяцей і свае фурманкі. Яшчэ некаторая частка людзей зышла ў загадзя падрыхтаваныя лагеры ва ўрочышчах "Верб'е " і "Чарнавішча" і наканец пэўная колькасць людзей перад непасрэдным прыходам карнікаў змагла ўцячы ў бліжайшыя лясы. У выніку засталіся тыя сем'і ў якіх не было фурманак, а таксама сем'і, дзе былі маленькія дзеткі альбо немоглыя старыя бацькі, праўда былі і тыя, хто проста не хацеў пакідаць



ПолесГУ

сваёй роднай хаты. Бяспрэчна, што пры ўсеагульнай любові і павазе, якімі карыстаўся бацюшка Іаан у прыхаджан, знайшліся б і фурманка для яго сямейства, і цёплае адзенне, і ежа. Але відаць, у гэтым і быў заключаны маральны выбар самога свяшчэнніка. Разумеючы, што ўсё насельніцтва партызанскага краю не зможа, не паспее ўратавацца, а збегчы са сваёй сям'ёй – сорамна! Добра ведаючы айчынную гісторыю, калі людзі ў Божых храмах бывала ратаваліся і заставаліся не кранутымі нават самымі злымі ворагамі, у бацюшкі Іаана цяплілася надзея прытуліць і спасці аднавяскоўцаў у сценах царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Ноччу з 12 на 13 лютага 1943 года галоўныя сілы партызан і частка мясцовага мірнага насельніцтва змаглі вырвацца з акружэння. Аднак фашысты прыступілі да актыўных дзеянняў супраць застаўшыхся мірных жыхароў і астаўленага для іх аховы невялікага партызанскага атрада. З 13 лютага 1943 года карнікі распачалі масавае знішчэнне мірнага беларускага насельніцтва ў партызанскай зоне. Менавіта ў гэты дзень здзейснілі свой подзвіг браты–патрыёты Цубы, якія былі духоўна выхаваныя бацюшкам Іаанам, бо з'яўляліся прыхаджанамі хорастаўскай Пакроўскай царвы. 70–ці гадовы Міхаіл Цуба першым заўважыў набліжэнне да сваёй вёскі Навіна фашыстаў, аб чым паспеў папярэдзіць вяскоўцаў, выратаваўшы іх ад немінучай смерці. Самаахвярна затрымаў карнікаў, наадрэз адмовіўся выканаць іх загад: паказаць дарогу да партызан, аказаў супраціўленне ворагу, за што быў расстраляны. 68–мі гадовы Іван Цуба завёў карнікаў у непраходнае балота паблізу рэчкі Лань, за што быў па–зверскі забіты. Аднак выбрацца з яго фашысты так і не змаглі. А раніцай 14 лютага былі перабіты падыйшоўшым сюды ахоўным партызанскім атрадам.[12, с.182].

15 лютага 1943 года на Хорастава былі кінуты ўсе сілы карнікаў. Па ўспамінах людзей, ноч на 15 лютага выдалася не толькі марознай з мяцеліцай, але і поўнай трывогі. Дзесьці грукаталі выбухі, чуліся адзіночныя стрэлы і трэск аўтаматаў. Ва ўсіх напрамках гарызонт гарэў зарывам спальваемых фашыстамі вёсак і хутароў.

Ёсць некалькі крыніц з якіх можна пачарпнуць інфармацыю як адбываліся далейшыя падзеі 15 лютага ў Хораставе. Гэта сведчанні відавочцаў, якіх фашысты заставілі ў жывых толькі таму, што ім спатрэбілася рабочая сіла для перагону людской жывёлы з Хорастава ў Мікашэвічы. (Не менш як 20 чалавек, сярод іх жыхары Хорастава Горбат Аляксей і трое яго дзяцей Аўдоц'я, Павел і Адам). Таксама жывымі сведкамі тых падзей з'яўляліся некалькі жанчын і дзяўчат, ў тым ліку дачка бацюшкі Іаана Вера вывезеныя затым на прымусовыя, катаржныя работы ў Германію, ёсць успаміны знакамітага польскага святара ксяндза Францішка Кубша, маюцца паказанні паліцэйскіх судзімых ваенным трыбуналам пасля вайны. За выключэннем некаторых дробязяў усе дадзеныя крыніцы амаль поўнасцю супадаюць і вызначаюцца сваёй дакладнасцю.

Але мы звернемся, да самай надзейнай крыніцы кнігі Паўла Раіны "За веру и Отечество", дзе аўтар паведамляе, што падзеі, якія адбыліся ў Хораставе ім запісаны са слоў Веры Іванаўны Лойка, якая была ў эпіцэнтры трагічнага здарэння. У той час прыгажуні Веры, якая ўваходзіла ў пеўчую групу дзяўчат не было і 18–ці гадоў. А ўжо праз два гады, у 1945 годзе, калі была вызвалена з канцлагера і вярнулася на Радзіму, па сведчанню Паўла Раіны, яна выглядала сівой, пастарэлай жанчынай [6, с. 37]. Згодна з расказам Веры Лойка ноч на 15 лютага, напярэдадні вялікага праваслаўнага свята Стрэчання Гасподняга (адзначаецца ўсімі праваслаўнымі людзьмі 15 лютага) для іх сямейства была не толькі бяссоннай, але і вельмі трывожнай. "На сэрцы бацюшкі Іаана было неспакойна, ён адчуваў на душы нейкі незразумелы цяжар, прадчуванне будучай бяды. Вельмі доўга маліўся. Затым азарыў сябе хросным знаменнем, падыйшоў да жонкі, дочак і сказаў: "Мілыя, давайце сягоння не будзем разлучацца. Пакуль я чытаю царкоўныя правілы, збярыце малых і пойдзем ў царкву". З хаты выйшлі ўсе разам. Наперадзе ішоў бацюшка Іаан з унукам і ўнучкамі Ганнай і Неанілай, а за імі дачка Вера, нявестка Ніна, матушка Вольга. Падышоўшы да царквы, бацюшка Іаан ўбачыў, што храм ўжо адчынены, а ў ім сабралася нямала народу з бліжэйшых сёл і хутароў. На душы стала крыху лягчэй" [6, с. 36, 37].

Багаслужэнне ў царкве пачалося, як заўсёды, каля шасці гадзін раніцы. Праз некаторы час паўсюдна сталі чуваць выстралы, даносіліся каманды на незнаёмай мове. Усім стала зразумела, што вёска акружана карнікамі. Бацюшку Іаану, які працягваў весці Боскую літургію было перададзена, што фашысты выганяюць усіх да аднаго з хат, нават не прыхаджан, і загадваюць усім ісці ў царкву на малітву. Прыкладна да сярэдзіны службы царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы была перапоўнена людзьмі, але з яе назад нікога не выпускалі.

А людзі ўсё падыходзілі і падыходзілі. Не малая колькасць іх сабралася ў царкоўным двары. Тут жа эсэсаўцамі былі адабраны два дзясяткі маладых мужчын, жанчын і падлеткаў, якіх адвялі ў бок. Як затым высветліцца, дзеля перагону нарабаванай жывёлы. Неўзабаве ўсіх тых, хто не змог

ПолесГУ

праціснуцца ў перапоўненую царкву і знаходзіўся на двары, па загаду афіцэра ўслужлівыя паліцэйскія пагналі за ваколіцу вёскі. Менавіта там знаходзіліся вялікія драўляныя кароўнікі з саломенымі стрэхамі, разлічаныя на 60–70 адзінак жывёлы. Акрамя прыгнаных ад царквы, каля кароўнікаў ужо быў вялікі натоўп людзей. Гэта тыя нешчасныя, як з Хорастава так і з суседніх вёсак якіх карнікі прыгналі з навакольніх лясоў, дзе яны імкнуліся захавацца. Па ўспамінах выжыўшых непрыкметна схавацца было вельмі цяжка, лес з самай раніцы абстрэльваўся самалётам, які такім чынам указваў месца знаходжанне людзей карнікам. Па прызнаннях тых жа паліцэйскіх у натоўпе каля кароўніка адчайна ў роспачы галасілі жанчыны, плакалі маленькія дзеці, а карнікі распачалі разыгрываць нікому непатрэбную інсцыніроўку з праверкай дакументаў. Пры гэтым у каго былі дакументы, і ў тых у каго іх не аказалася, ўсяроўна заштурхоўвалі ў кароўнік.

Тым часам у царкве працягвалася літургія. Адчуўшы небяспеку, бацюшка Іаан у краткім звароце заклікаў усіх прысутных старанна памаліцца і прычасціцца Святых Тайн. Падчас усеагульнага спявання “ Верую” у Божы храм уварваліся фашысты. Па сведчанню жанчын, якія затым будуць накіраваныя на катаржныя работы ў Германію, афіцэр прапанаваў бацюшку Іаану пакінуць храм. Але ён з годнасцю заявіў: “Свой лёс я не аддзяляю ад лёсу маёй паствы. Што будзе з імі, хай здейсніцца і са мной”[3, с. 197]. Тут жа па загаду афіцэра адныя з салдат прымяняючы сілу пачалі выцягваць з натоўпу маладых жанчын, другія выштурхоўваць з кліраса зусім яшчэ юных пеўчых.

Бацюшка Іаан паспрабаваў заступіцца. Тады яго некалькі разоў ударылі і падцягнулі да афіцэра. Свяшчэннік запатрабаваў у афіцэра даць магчымасць скончыць яму богаслужэнне. У адказ на гэта адзін з фашыстаў схапіў бацюшку Іаана і кінуў яго на царскія вароты. Яны адчыніліся, і святар упаў прама перад Божым пасадам. Тыя, хто былі выведзеныя з царквы і адабраныя для перагону жывёлы бачылі як да царквы коньмі былі падвезены некалькі саней з саломай, а дзверы храма моцна забіваліся цвікамі. У адно імгненне вока, зробленая з сухога дрэва царква запылала. Дзясяткі агеньчыкаў паднімаліся высока да крыжа, спавітага дымам. Гарэлі валасы, гарэлі твары і адзенне стоячых шчыльным гуртам аднавяскоўцаў. Пераносячы нясцерпную боль, разам з бацюшкай Іаанам, голас якога выразна даносіўся з пылаючай царквы – усе прыхаджане маліліся. З паказанняў паліцэйскіх, што удзельнічалі ў акцыі знішчэння, у гарашчай царкве людзі пелі малітву: “Цела Хрыстова прыміце, крыніцу безсмяротнага ўкусіце…”[3, с. 196]. Апасля па сведчанню відавочцаў незасталося ніякіх асмаленых трупаў і ніякіх асобных магіл, аб якіх зараз многія пішуць, на пажарышчы была толькі адна магіла на ўсіх 300 прыхаджан і бацюшку Іаана – на якой дзе–нідзе былі бачны абвугляныя чалавечыя косткі. (А тыя загароджаныя і не загароджаныя магілкі каля месца спаленай царквы, што захаваліся да нашых дзён – гэта проста пахаванні памёршых людзей напрыканцы вайны і ў пасляваенны час).

Адначасова прыкладна па такому сцэнарыю адбылося знішчэнне тых людзей, якія былі загнаны фашыстамі за ваколіцу вёскі. Іх зажава спалілі ў кароўніках. А як толькі ўся жывёла была выгнанна з падвор’яў, па сведчанню адабраных фашыстамі пастухоў–перагоншчыкаў, адна за другой пачалі пылаць падпаленыя хаты. У выніку ўся вёска згарэла дашчэнту.

Аб трагедыі 15 лютага 1943 года ў Хораставе ёсць напісаныя нататкі настаяцеля пузічскага касцёла Святой Ганны ксяндза Францішка Кубшы, дзе ён паведамляе: “Ад людзей я даведаўся, што гітлераўцы сагналі ўсіх жыхароў Чаланца, Хорастава і частку жыхароў Пузічаў, а таксама Рахавічаў, мужчын, жанчын і дзяцей, для выконвання масавай экзэкуцыі. Людзі плакалі, дзеці крычалі, многія маліліся аб дараванні ім жыцця дзеля ўсяго святога. Праваслаўны святар звяртаючыся да ўсіх прысутных, сказаў, каб усе прыгатаваліся да сустрэчы з Усявышнім. Разбудзіў словамі смутак за зробленныя грахі і адпусціў усім грахі. Загінуў справядлівы “бацюшка” разам з сваёй сям’ёй, загінулі яго і мае прыхаджанне” [9, с. 67].

Затым, пасля блакады пад канец мая 1943 года па асабістаму загаду І. В. Сталіна за ксяндзом Францішкам Кубшам з Масквы быў накіраваны самалёт. А 24 лютага 1944 года ён прымае актыўны ўдзел у другім Усеславянскім з’ездзе ў Маскве [10, с. 144]. Выступаючы з дакладам у Калонным зале Дома Саюзаў, Кубш публічна заклеймаваў ганьбай нацыскіх забойцаў. З яго слоў, непасрэднага відавочцы трагічных падзей аперацыі “Горнунг”, увесь свет даведаўся аб масавым знішчэнні гітлераўскімі варварамі жыхароў вёсак Хорастаўскага рэгёну, узарваным касцёле Святой Ганны ў Пузічах, зажыва спаленых прыхаджанах у хорастаўскай Пакроўскай царкве разам з бацюшкам Іаанам [12, с. 7].

Такім чынам, усё жыццё і дзеянні Івана Сямёнавіча Лойкі паказваюць, што ён быў і застанецца ў людскіх сэрцах сапраўдным народным любімцам, Вялікім праваслаўным духоўнікам і патрыётам сваёй Айчыны. Ён добраахвотна прыняў пакутніцкую смерць у палымнеючай царкве разам з

Полесгу

сваімі аднавяскоўцамі–прыхаджанамі, думкі і пачуцці якіх добра ведаў, з якімі дзяліў усе радасці і нягоды, надзею і смутак свайго трагічнага і гераічнага лёсу.

У выніку карнай аперацыі “Горнунг” загінуў кожны трэці жыхар Хорастаўскага краю. Калі ўлічыць загінуўшых затым франтавікоў і партызан, Хорастаўшчына страціла за гады вайны кожнага другога. Толькі падчас дадзенай карнай аперацыі было спалена каля 70 вёсак і 14 праваслаўных цэркваў[12, с.52].

Свяшчэннікі гэтых цэркваў, як і бацюшка Іаан, не здрадзілі свайму народу, а ў цяжкі час выконвалі свой пастырскі абавязак і памяталі не пра сябе, а пра іншых. Акрамя непасрэдных абавязкаў, формы дапамогі іх былі розныя: забяспечвалі харчаваннем, медыкаментамі, прадастаўлялі прытулак для адпачынку партызан, лячылі параненых, даставалі патрэбныя дакументы, пісалі акупацыйным уладам фіктыўныя даведкі, хавалі моладзь ад выгнання ў Германію і г.д. Адна справа як паводзіць сябе і вясці набажэнства ў моцным савецкім тыле і зусім іншая на акупіраваннай германскімі войскамі тэрыторыі. Менавіта ва ўмовах акупацыі бацюшка Іаан паўстаў актыўным змагаром супраць ворага, праявіў сябе сапраўдным патрыётам праваслаўнай веры і сваёй Радзімы, а ў цяжкую гадзіну падзяліў горкую долю са сваімі прыхаджанамі. Трагічныя падзеі 15 лютага 1943 года і па сённяшні дзень незажываючая, краватачывая рана для ўсіх жыхароў Хорастаўшчыны, так як спынілі сваё існаванне некаторыя вёскі, зніклі многія кланы, роды, прозвішчы людзей гэтых вёсак.

Прааналізаваўшы ў дадзенай рабоце увесь жыццёвы шлях свяшчэнніка Іаана Лойкі, патрэбна зазначыць, што, яго асоба ў поўнай ступені адпавядае да разгляду Рускай Праваслаўнай царквой, як кандыдатура на першачарговае залічэнне ў лік святых.

**Спіс літаратуры**


1. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Фонд 295. – Воп.1. – С. 8642. – Л.98.
2. НАРБ. Фонд 295. – Воп.1. – С.8642. –Л.36.
3. Ясько, А. Ф. Больно даже мёртвым: Палесская трагедія / А. Ф. Ясько. – Минск : Бонем, 2012. – 400 с.
4. Цуба, М.В. Жыццё і подзвіг братом Цубаў / М. В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2013. – 73 с.
5. Цуба, М.В. В.З. Корж: невядомыя і малавядомыя старонкі жыцця / М.В. Цуба. – Пінск : ТДА “ІРА “Паляшук”, 2009. – 88 с.
6. Раина, П. За веру и Отечество / П. Раина. – Ленинград, 1990. – 37 с.
7. Смирнов, Н.И. Василий Мудрый / Н.И.Смирнов. – Минск : Беларусь, 2009. – 335 с.
8. Памяць: Гіст.–докум. Хроніка Лунінецкага раёна / Укл. Т.В.Канапацкая. – Мінск : Беларусь, 1995. – 716 с.
9. Zieliński, S. Ze Wshodu z kapelanem / S.Zieliński. – Warszawa: Wydawnictwo Vipart, 1997. – 160 s.
10. Нордман, Э.Б. Не стреляйте в партизан… / Э.Б.Нордман. – Минск: Беларусь, 2007. – 200 с.
11. Цуба, М.В. З крыжам і аўтаматам / М.В.Цуба // Заря (Брестская областная газета ). – 2014. – 5 июня.
12. Силова, С.В. Крестный путь: белорусская православная церковь в период немецкой оккупации 1941 – 1944 гг. / С.В.Силова. – Минск : Белорусский Экзархат, 2005. – 71с.
13. Корж, Е.С. Вся жизнь – Отчизне / Е. С. Корж. – Минск : Беларусь, 1984. – 239 с.



**Рэзюмэ.** У выніку даследавання зроблены наступныя высновы:

1. Любоў да праваслаўнай веры, да роднай старонкі і сваёй Радзімы святару І.С.Лойку былі прывіты бацькамі з самага маленства. Гэтыя высакародныя патрыятычныя пачуцці бацюшка Іаан пранясе праз усё сваё жыццё. І ў гэтым жыцці яго рэлігійная місія будзе цесна звязана з Хорастаўскім краем.

2. У няпростых жыццёвых сітуацыях, у якіх аказваўся бацюшка Іаан на Хорастаўшчыне ў гады Першай сусветнай вайны, падчас польскай улады на нашых землях, а таксама ва ўмовах камуністычнай прапаганды атэізма, ён ніколі не страчваў веру ў людзей, праводзіў вялікую рэлігійна–асветніцкую работу, скіраваную на праваслаўнасць, усім жадаючым даваў добрыя, мудрыя саветы. Усё гэта з цягам часу прывяло да значнага колькаснага павелічэння хорастаўскага царкоўнага прыходу.

3. Падчас вайны, будучы ў цяжкім становішчы, наколькі дазвалялі абставіны, І.С.Лойка імкнуўся нават ва ўмовах акупацыі вясці мэтанакіраваную патрыятычную работу з сваімі прыхад-




Полесгу

жанамі, накіраваную на змаганне з ворагам. Асабістым прыкладам заклікаў і заахвочваў паству для барацьбы з захопнікамі (маральна падтрымліваў прыхаджан, адгаворваў слабых ад супрацоўніцтва з акупантамі, заклікаў ні ў якім разе не ехаць на катаржныя работы ў Германію, а ісці ў партызаны і змагацца, куды накіраваў і сваіх трох сыноў, усяляў людзям веру ў Перамогу над ворагам).

4. У ходзе аперацыі “Горнунг”, разумеючы, што партызан разграміць не ўдалося, так як яны з часткай насельніцтва прарвалі блакаду і выйшлі з акружэння, карнікі вырашылі спагнаць злосць на мірных жыхарах, з якімі застаўся бацюшка Іаан.

Ведаючы з Айчыннай гісторыі, як людзі ратаваліся ў мінулым ад варожых набегаў у Божых храмах, святар Іаан імкнуўся спасці аднавяскоўцаў у сценах царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

Падчас уварвання фашыстаў у царкву святар І.С.Лойка адказаўся ад прапановы акупантаў пакінуць царкву, заступіўся за сваіх прыхаджан, за што быў збіты, а затым, з палаючай царквы, гучала яго прадсмяротная малітва. Так разам з прыхаджанамі падзяліўшы іх лёс загінуў Пакутнік за Веру, Айчыну і людзей – бацюшка Іаан, выканаўшы сваю рэлігійную місію да канца.

5. Іван Сямёнавіч Лойка моцна любіў цудоўны і прыгожы куточак палескай зямлі пад назвай Хорастаўшчына. Тут ён у Божым храме адслужыў каля 30–ці гадоў. А памяць аб ім назаўсёды засталася ў гэтай старонцы. На месцы спаленай фашісцкімі захопнікамі царквы, дзе праводзіў набажэнствы свяшчэннік Іаан адбудавана новая царква з такой жа назвай. Там, дзе адбылася пакутніцкая смерць бацюшкі Іаана і яго прыхаджан, плануецца паставіць памятны знак, а ў экспазіцыі хорастаўскага музея Партызанскай Славы імя В.З.Каржа будзе прадстаўлены матэрыял, прысвечаны гэтаму выдатнаму чалавеку–патрыёту.

**Abstract**. As a result of the study, the following conclusions are drawn:

1. Love from the Orthodox faith, to the native and their Motherland priest ISLoik was welcomed by parents from childhood. These noble patriotic feelings Father John will carry through all his life. And in this life his religious mission will be closely connected with the Horastavsky region.

2. In the difficult life situations in which Father John was at Khorastavshchyn during the First World War, during Polish power in our lands, and also in the conditions of communist propaganda of atheism, he never lost faith in people, conducted great religious and educational work , aimed at pravoslavnasts, gave all wishing people good, wise advice. All this eventually led to a significant increase in the chorastavkaz of the parish church.

3. During the war, being in a difficult situation, as circumstances allowed, ISLoika tried even in the conditions of occupation to conduct a purposeful patriotic work with his parishioners, aimed at fighting the enemy. He personally encouraged and encouraged the flock to fight the invaders (morally supported the parishioners, dissuaded the weak from cooperation with the invaders, called on them not to go to hard labor in Germany, and go to the guerrillas and fight where he sent his three sons, people faith in the victory over the enemy).

4. During Operation Gornung, understanding that the guerrillas could not be defeated, as they broke through the blockade with part of the population and left the encirclement, the punishers decided to frustrate the civilians with whom Father Ivan remained.

Knowing from the history of the world how people saved themselves from the enemy raids in God's temples in the past, priest John strove to save the fellow villagers within the walls of the Church of the Intercession of the Blessed Virgin.

During the invasion of the Nazis, the priest I.S.Loyka made an offer from the invaders to leave the church, stood up for his parishioners, for which he was beaten, and then, from the burning church, his death–dying prayer sounded. So together with the parishioners sharing their fate, the Martyr died for the Faith, the Fatherland and the people – Father John, having fulfilled his religious mission to the end.

5. Ivan Semyonovich Loiko strongly loved the beautiful and beautiful corner of the Polissya land called Khorastavshchyna. Here he served in God's temple for about 30 years. And the memory of him is forever in this page. In the place burned by the Fascist invaders of the church, where the services of priest John were conducted, a new church with the same name was built. Where there was a martyr's death of Father John and his parishioners, it is planned to put a commemorative sign, and in the exposition of the Horastavkaz of the Museum of Partisan Glory named after V.Z. Karzh, material on this remarkable patriotic man will be presented.

ПолесГУ

**TZUBA M.V.,** Cand. of Histor. Sc., Associate Professor,
Assistant Professor of Historical and Cultural Heritage,
Polessky State University, Pinsk, Republic of Belarus

## SOCIAL AND RELIGIOUS ACTIVITIES OF IOAN LOIKA IN THE HORASTOVSKY REGION

*This article explores religious activities and the tragic fate of the Orthodox priest Ioan Semenovich Loika, who during the war years was burned alive with the believers of his parish by the fascist invaders in the village of Horostovo for helping the partisans.*
*Particular attention is paid directly to religious work and the fulfillment of church duties. Loiki during the Great Patriotic War.*

***Keywords:*** *priest, priest, Orthodox faith, parish, punitive operation, worship, sacrifices.*

**References**

1. National archive of the Republic of Belarus (NARB). Fund 295, Vop.1, P. 8642, L. 98.
2. NARB. Foundation 295. Vol. 1. P.8642. L.36.
3. Yasko A.F. *Bol'no dazhe mjortvym: Palesskaja tragedija* [It hurts even dead: Polesskiy tragedy]. Minsk, Bonem, 2012, 400 p.
4. Tsuba M.V. *Zhyccjo i podzvig bratom Cubaў* [Life and feat of the Tsuba brothers]. Pinsk, PolesU, 2013, 73 p.
5. Tsuba M.V. *V.Z. Korzh: nevjadomyja i malavjadomyja staronki zhyccja* [V. Z. Korzh: unknown and little–known pages of life]. Pinsk, ODO «IRA» Pleshush «, 2009, 88 p.
6. Rain P. *Za veru i Otechestvo* [For Faith and the Fatherland]. Leningrad, 1990, 37 p.
7. Smirnov N.I. *Vasilij Mudryj* [Vasily Mudrye]. Minsk, Belarus, 2009, 335 p.
8. Memory: east. – documents. Chronicle of the Luninets district / incl. T.V. Kanapatskaya. Minsk, Belarus, 1995, 716 p.
9. Zieliński, S. *Ze Wshodu z kapelanem*. Warszawa, Wydawnictwo Vipart, 1997, 160 s.
10. Nordman E.B. *Ne streljajte v partizan…* [Do not shoot a partisan … ]. Minsk, Belarus, 2007, 200 p.
11. Tsuba M.V. Z kryzham i aўtamatam [With a cross and a submachine–gun]. *Zarja* [Zorya] (Brest Oblost newspaper). – 2014, 5 June.
12. Silova S.V. *Krestnyj put': belorusskaja pravoslavnaja cerkov' v period nemeckoj okkupacii 1941 – 1944 gg.* [The Way of the Cross: the Belarusian Orthodox Church during the German occupation, one thousand nine hundred and forty–one – 1944]. Minsk, Belarusian Exarchate, 2005, 71s.
13. Korzh E.S. *Vsja zhizn' – Otchizne* [All Life – Fatherland] Minsk, Belarus, 1984, 239 p.

*Received 2 April 2018*

ПолесГУ